# Геаграфія дзелавога супрацоўніцтва: Італія



## Джуліо ПРЫДЖОНІ:

# «ФАНТАЗІЯ ПАВЫШАЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПАРТНЁРСТВА»

**Узаемны тавараразварот Беларусі і Італіі па выніках мінулага года перавысіў адзін мільярд долараў. Ацэньваючы патэнцыял абедзвюх краін, бачым, што гэты паказчык можа быць павялічаны. Якім чынам? На гэтае і шэраг іншых пытанняў «Звязды» адказвае Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Італьянскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Джуліа ПРЫДЖОНІ.**

— Што датычыцца гандлю паміж Італіяй і Беларуссю, — гаворыць спадар Прыджоні, — то тавараразварот у адзін мільярд долараў, безумоўна, не можа нас задавальняць. Мы паспрабуем павялічыць паказчык. Для чаго са свайго боку плануем павысіць аб'ём закупак. Усё, вядома ж, будзе залежаць ад таго, якое развіццё атрымае цяперашні крызіс у будучыні, бо яшчэ год таму, падчас работы над сваёй кнігай аб суверэнных фондах, я, як і многія іншыя, спадзяваўся, што з глабальнага фінансавага сектара крызіс не пяройдзе ў сектар рэальнай эканомікі. Але, на жаль, сёння гэты вірус пашкодзіў эканомікі практычна ўсіх краін свету. І цяпер перад намі стаіць толькі адна задача — знайсці якое-небудзь выйсце з гэтай няпростай сітуацыі. Што мы можам зрабіць? Перш за ўсё, не павінны ісці па сцяжынцы пратэкцыянізму, бо гэта азначала б адмову ад тых даброт, якія дае глабалізацыя. Мы ведаем, што эканоміка будзе цвёрда стаяць на нагах, калі ўзаемны тавараразварот з іншымі краінамі свету будзе стабільным. У першую чаргу, Італія і Беларусь, як і кожная краіна ў асобнасці, павінны абараняць, наколькі гэта магчыма, пакупную здольнасць сваіх спажыўцоў. Мы разумеем, што ў Еўрапейскім саюзе асобныя краіны больш не кантралююць валютны рычаг, каб мець магчымасць знізіць цэны на нацыянальныя прадукты на знешніх рынках. Беларусь яшчэ можа гэта зрабіць для таго, каб яе прадукцыя стала больш канкурэнтнай на нашых рынках. Але ўсё добра ў меру. Патрэбна быць вельмі асцярожнымі, таму што не павінна расці інфляцыя, бо з цягам часу яна становіцца несправядлівым цяжарам для спажыўцоў. Сёння лепш выкарыстоўваць рычагі павышэння прадукцыйнасці, каб стварыць канкурэнтныя цэны і прывабіць найбольшыя фінансавыя інвестыцыі з-за мяжы. Пасля візіту ў Беларусь дэлегацыі Міжнароднага валютнага фонду, які, дарэчы, прынёс практычныя вынікі, еўрапейскія банкі таксама змогуць у большай ступені ўздзейнічаць на беларускую эканоміку пры ўмове, што абраны шлях будзе працягваць развівацца ў пажаданым пазітыўным напрамку.

***— Спадар пасол, Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва з'яўляецца адным з найбольш эфектыўных напрамкаў беларуска-італьянскага ўзаемадзеяння. У прыватнасці, нядаўна прадпрымальнікі з правінцыі Мантуя, якая ўваходзіць у вобласць Ламбардыя, звярнуліся да беларускага боку з цэлым шэрагам выгадных прапаноў. Якія канкрэтныя крокі ў гэтым плане робяць іншыя вобласці, а іх у Італіі налічваецца 20?***

— Давайце не будзем засяроджваць увагу толькі на італьянскіх абласцях. У нас ёсць таксама правінцыі, цэнтры і розныя дзяржаўныя ўстановы. Але самае галоўнае — гэта людзі. Поспех ініцыятыў Мантуі звязаны перш за ўсё з прысутнасцю поўнага новых ідэй чалавека. Такога, як спадар Фантоні, які ператварае іх у жыццё. У сувязі з гэтым я хацеў бы адзначыць яшчэ вобласць Сардынію і спадара Карбоні, які дабіўся на рэгіянальным узроўні асобных нормаў, што спрыяюць развіццю адносінаў з Беларуссю, перш за ўсё ў плане спецыяльнай прафесійнай падрыхтоўкі ў абедзвюх краінах. Вельмі перспектыўнай сферай, напрыклад, з'яўляецца дызайн. Яшчэ адзін рэгіён, які хочацца назваць, гэта правінцыя Пескара з яе прадстаўніком спадаром Паскуалі. Як вядома, горад Пескара знаходзіцца ў вобласці Абруца, якая некалькі месяцаў таму пацярпела ад землятрусу. Узаемаадносіны гэтай правінцыі з Беларуссю паспяхова развіваюцца, і, я думаю, дадуць добры плён. Як бачыце, спадар Фантоні з Мантуі, спадар Карбоні з Сардыніі і спадар Паскуалі з Пескары маюць новы канкрэтны погляд на будучыню нашых адносінаў. Я мог бы дадаць да іх многіх іншых людзей, што бачаць, якім чынам можна паўплываць на развіццё нашых адносінаў. Спадзяёмся, што такіх людзей, вельмі канкрэтных і практычных, будзе больш як з боку Італіі, так і з боку Беларусі.

***— У красавіку ў Рыме былі праведзены кансультацыі паміж міністэрствамі замежных спраў Італіі і Беларусі, у рамках якіх абмяркоўваліся пытанні, што датычыліся гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Якія інавацыйныя падыходы прапануе італьянскі бок для паляпшэння партнёрства ў эканамічнай сферы?***

— Я ўжо згадаў самага каварнага суперніка, з якім трэба змагацца. Гэта «пратэкцыянізм», які перашкаджае развіццю ўзаемаадносінаў паміж краінамі. Цяпер хачу прывесці прыклад унутранага ворага, які пастаянна павялічвае выдаткі і не спрыяе развіццю адносінаў. Гэты супернік ёсць у Беларусі, Італіі і ў многіх іншых краінах. Гаворка ідзе аб «крайняй бюракратызацыі» ўсіх эканамічных узаемаадносінаў. Наш падыход заключаецца ў тым, каб палепшыць сітуацыю. У вырашэнні гэтага пытання павінны прысутнічаць два вельмі важныя элементы — спрашчэнне адміністрацыйных працэдур і прафесійная падрыхтоўка. Што датычыцца інавацыйных падыходаў для паляпшэння партнёрства ў эканамічнай сферы, павінен сказаць, што мы стараемся знаходзіць пункты ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва ў розных спецыфічных галінах. Такіх, як, напрыклад, ветэрынарыя. Аграпрамысловая галіна ў Беларусі развіваецца нядрэнна, але, тым не менш, і яе можна палепшыць. Тое самае можна зрабіць для аграпрамысловай галіны Італіі. І не будзем забываць, што ёсць таксама і іншыя важныя сферы, дзе магчыма супрацоўніцтва: прамысловыя тэхналогіі, дызайн і, асабліва, станкабудаванне, у якім Італія заўсёды была лідарам. Мы павінны правесці маніторынг гэтых галін і спрыяць іх агульнаму развіццю.

***— Спадар Прыджоні, дагаворна-прававая база, на якой грунтуюцца адносіны Беларусі і Італіі, стваралася ў той час, калі праблема крызісу не стаяла так востра. Сёння сітуацыя змянілася. Па ўсёй бачнасці, наяўныя дакументы патрабуюць карэктыў. Якія з іх варта адаптаваць да сучасных умоў? Якія новыя дамовы неабходна падпісаць?***

— Безумоўна, многія пытанні і пункты гледжання пасля ўзніклага сусветнага фінансавага і эканамічнага крызісу змяніліся. І сёння мы думаем пра новыя дамовы. У першую чаргу, пра агульны эканамічны дагавор, сумяшчальны з патрабаваннямі ЕС, а таксама пра дамовы ў галіне культуры, мастацтва і экалогіі. Мы спадзяёмся завяршыць іх падрыхтоўку восенню. Гэтыя дакументы створаць аснову для новых, больш вузкіх дамоўленасцяў. У гэтай сувязі хачу адзначыць, што мяне прыемна ўразіла тое, што беларускі бок часта выступае ініцыятарам падобных дамоў і тым самым глядзіць наперад. Напрыклад, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт падпісаў шэраг дамоў з найважнейшымі ўніверсітэтамі і навуковымі цэнтрамі ўсёй Італіі. У нас і ў іншых галінах ёсць шмат спецыялізаваных устаноў, якія дасягнулі поспехаў у сваім развіцці і могуць прапанаваць эфектыўнае супрацоўніцтва ў любой сферы: ад механікі да фізікі, ад матэматыкі да астрафізікі, а таксама ў галіне апрацоўкі матэрыялаў, моды, перадавых тэхналогій.

***— У Беларусі зарэгістравана больш за 80 прадпрыемстваў з удзелам італьянскага капіталу, што сведчыць пра зацікаўленасць італьянскіх бізнэсменаў у далейшым наладжванні бізнэсу ў нашай краіне. Якія ж перспектывы беларуска-італьянскага інвестыцыйнага супрацоўніцтва? Якія новыя праекты ў гэтым плане можа прапанаваць Італія ў найбліжэйшы час?***

— Па-першае, хачу паведаміць вельмі цікавую навіну, якая з'явілася па выніках візіту дэлегацыі найбуйнейшых італьянскіх банкаў, якія выказалі станоўчае меркаванне наконт супрацоўніцтва Італіі і Беларусі, а таксама адносна перспектыў доўгатэрміновага эканамічнага развіцця дзвюх краін. У гэтай сувязі італьянскае Таварыства па ахове інвестыцый (SACE) павялічыла той плафон, які будзе прадастаўлены Рэспубліцы Беларусь, на 20 мільёнаў еўра. Гэты крок, зроблены нашымі фінансавымі ўстановамі, дазволіць павялічыць тавараразварот прадукцыі, а таксама закупкі тавараў мясцовага паходжання. Формы могуць быць самыя розныя, сярод іх, вядома ж, класічнае сумеснае прадпрыемства.

Не трэба забываць і пра тыя велізарныя прывілеі, якія даюць патэнты, гандлёвыя маркі, аўтарскія правы, усё тое, што з'яўляецца інтэлектуальнай уласнасцю, нематэрыяльнае багацце — важны агульны дадатковы рэсурс. Ужо ёсць прыклады выкарыстання італьянскіх патэнтаў не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і ў Расіі і Казахстане. Таму мы хочам звярнуцца да розных даследчых цэнтраў і ўніверсітэтаў Беларусі, запрашаючы іх надаваць больш увагі менавіта даследаванням і развіццю інавацый, якія дазваляюць знаходзіць новыя спосабы вытворчасці, быць не толькі крэатыўнымі, але і інавацыйнымі, а таксама мець ахову на міжнародным узроўні. У Італіі ёсць велізарныя магчымасці ў сферы дызайну, аховы навакольнага асяроддзя, механікі, а таксама інфраструктуры ў цэлым, і ў гэтых сферах можна знайсці шэраг нематэрыяльных каштоўнасцяў, звязаных з крэатыўнасцю, якія могуць прывабіць здольных маладых беларусаў, даследнікаў або простых працаўнікоў у магчымыя сумесныя прадпрыемствы, прыбытковыя для абодвух бакоў. І тут я маю на ўвазе тую велізарную карысць, якую могуць прынесці для развіцця сваёй краіны сотні тысяч беларусаў, для якіх сёння італьянская мова стала другой або трэцяй.

***— Спадар пасол, узаемавыгаднае партнёрства Беларусі і Італіі грунтуецца на мностве фактараў, сярод якіх — навукова-тэхнічнае ўзаемадзеянне. З якімі новымі формамі супрацоўніцтва і інавацыйнымі праектамі ў гэтай сферы гатовы выступіць італьянскі бок у найбліжэйшай перспектыве?***

— Творчасць сама па сабе не з'яўляецца інавацыяй. Для таго, каб яна стала такой, ёй патрэбна знайсці прымяненне ў якім-небудзь канкрэтным прамысловым працэсе. Мы спадзяёмся абмеркаваць усе гэтыя пытанні на Гандлёва-эканамічным форуме, які арганізаваны Пасольствам Італіі сумесна з беларускімі ўстановамі і пройдзе ў рамках праекта «Італьянскае адраджэнне ў Беларусі» ў кастрычнікулістападзе ў Мінску. Вельмі важна, каб рэалізацыя гэтага форуму абмяркоўвалася паміж прадпрымальнікамі Беларусі і Італіі. Мы павінны быць як можна больш канкрэтнымі. Афіцыйныя візіты на высокім узроўні, запланаваныя гэтай восенню, без сумнення, дадуць моцны імпульс адносінам паміж Беларуссю і Італіяй. Я хацеў бы таксама падкрэсліць, што праект «Італьянскае адраджэнне ў Беларусі» быў створаны для таго, каб пазнаёміць з творамі італьянскага мастацтва, а таксама пагаварыць пра італьянскую і беларускую культуры. Запрашаем усіх, хто гаворыць або яшчэ не гаворыць на італьянскай мове. Карыстаючыся гэтай магчымасцю, мы хочам прадставіць тут Італію ва ўсёй яе поўнасці, як рабілі вашы продкі, такія, як Францыск Скарына і Радзівіл Сіротка, якія наведвалі Італію ў XVI стагоддзі. Яны палюбілі яе і прывезлі на беларускія землі лепшыя дасягненні таго часу.

***— Сёння шырока абмяркоўваецца праграма добрасуседства Еўрасаюза «Усходняе партнёрства», у якую ўключана Беларусь. Якой магла б быць роля Італіі ў ажыццяўленні сумесных праектаў у рамках гэтай праграмы?***

— Італія працавала дзень за днём на працягу апошніх месяцаў для таго, каб даць як мага больш канкрэтнае напаўненне Ўсходняму партнёрству. Над гэтым працуюць еўрапейскія краіны і ўстановы, якія, на мой погляд, змогуць аказаць неабходную падтрымку беларускай эканоміцы для паспяховага працягу руху па шляху мудрых распачынанняў беларускага Урада. У Еўрапарламенце існуе камітэт дружбы Італія—Беларусь, які робіць усё магчымае, каб спрыяць гэтаму шляху і ўмацаваць развіццё адносінаў Беларусі і Еўрасаюза. Крок за крокам мы рухаемся да глыбокага паразумення, прымаючы да ўвагі складаную эканамічную сітуацыю. Дазвольце мне, тым не менш, скончыць словамі рускага эканаміста XIX стагоддзя Гілярова-Платонава, на жаль, невядомага на Захадзе. Ён ужо тады пісаў у сваёй невялікай, але значнай кнізе пра тое, што калі гаворка ідзе аб эканоміцы, неабходна надаваць адмысловую ўвагу таксама, а, можа быць і перш за ўсё, этычным і сацыяльным бакам, бо ў выніку мы ўсе будзем жыць лепей у грамадстве, якое здолеем пабудаваць разам.

**Размову вялі**
**Кацярына ДАРАФЕЙЧЫК**
**і Барыс ЗАЛЕСКІ.**